# Старажытная Індыя

## Урок сусветнай гісторыі ў V класе

Л. Г. Паўлава, настаўніца гісторыі Краснадворскай сярэдняй школы
Салігорскага раёна Мінскай вобласці

**Мэта:** даць уяўленне пра месца Індыі ў гісторыі Старажытнага свету.

**Задачы:**

• *навучальная* — пазнаёміць вучняў з геаграфічным становішчам, прыроднымі ўмовамі, заняткамі і структурай грамадства Індыі;

• *развіццёвая* — садзейнічаць развіццю гістарычнай памяці, мыслення, пазнавальнай цікавасці да працэсу навучання, фарміраванню навыкаў працы з камп'ютарам;

• *выхаваўчая* — выхоўваць пачуццё павагі да традыцый і гістарычнага мінулага краін свету.

**Тып урока:** засваенне новага матэрыялу.

**Форма правядзення:** урок з выкарыстаннем ІКТ.

**Забеспячэнне ўрока:** падручнік для IV класа «Гісторыя Старажытнага свету» / пад рэд. У. С. Кошалева; прэзентацыя з выкарыстаннем камп'ютарнай праграмы Microsoft power point; індыйская музыка; духмяныя палачкі; карткі з заданнямі.

### Ход урока

**План**

***I. Арганізацыйны момант*** (вітальнае слова настаўніка, матывацыйны настрой).

***II. Тлумачэнне новага матэрыялу.***

1. Утварэнне дзяржавы ў Старажытнай Індыі.

2. Старажытнаіндыйскае грамадства.

3. Гаспадарчае жыццё.

**Настаўнік.** На мінулых уроках мы пазнаёміліся з гісторыяй розных краін. Успомніце, якіх. *(Вучні называюць Егіпет, Вавілонію, Асірыю, Фінікію і інш.)* Даведаліся аб прыгожых гарадах, жыхары якіх маглі ствараць цудоўныя рэчы. Шмат з іх захавалася і да нашых дзён.

Сёння мы пазнаёмімся з гісторыяй яшчэ адной краіны. Наша падарожжа пачынаецца. *(Настаўнік запальвае духмяную палачку і ўключае індыйскую музыку.)* Дык у якую краіну з вамі адправімся? Канечне, гэта дзівосная краіна Індыя. А што б вы хацелі даведацца аб ёй? *(Вучні адказваюць.)*

На маніторы камп'ютара з'яўляюцца пытанні, якія будуць разглядацца на ўроку:

**1. Утварэнне дзяржавы ў Старажытнай Індыі.**

Настаўнік прапануе вучням запісаць дату і тэму ўрока. Вучні вывучаюць змешчаны на слайдах матэрыял і адказваюць на пытанні настаўніка: дзе знаходзіцца Індыя? Назавіце горы і рэкі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Індыі.

**Настаўнік.** Індыя знаходзіцца на поўдні Азіі. З захаду, усходу і поўдня берагі Індыі амывае Індыйскі акіян. З поўначы яна абмежавана Гімалаямі, самымі высокімі гарамі ў свеце. На тэрыторыі Індыі працякаюць буйныя рэкі Інд і Ганг. *(Вучні запісваюць у сшытак назвы рэк.)*

Вучні разглядаюць наступны слайд і адказваюць на пытанні: калі ўзнікла дзяржава ў даліне Інда? Якія яна мела сталіцы? Як называліся жыхары гэтай краіны? Што здарылася з гэтай дзяржавай?

Настаўнік звяртае ўвагу на карту і паказвае дзве сталіцы Індскай дзяржавы (Махенджа-Дара і Харапу). *(Вучні запісваюць у сшытак іх назвы.)*

**Настаўнік.** Махенджа-Дара, вялікі і прыгожы горад, быў агароджаны высокай сцяной, меў шырокія і зручныя вуліцы. Некаторыя дамы будавалі ў некалькі паверхаў. Тут быў водаправод. Жыхары краіны дзяліліся на бедных і багатых, а ўзначальвалі індцаў жрацы. Пасля 1800 г. да н. э. Індская дзяржава прыходзіць у заняпад. Прычыны невядомыя. Лічыцца, што імі сталі частыя

навадненні, наступленне лясоў. Але многія гарады, у тым ліку Махенджа-Дара, загінулі раптоўна і трагічна. Пры раскопках былі знойдзены шкілеты жыхароў, якія сустрэлі сваю смерць на вуліцы горада, на цагляных дамах былі заўважаны сляды агню. Невядомыя заваёўнікі захапілі і разбурылі горад.

**2. Старажытнаіндыйскае грамадства.**

Вучням прапануецца перайсці да наступнага слайда і адказаць на пытанні настаўніка: калі прыйшлі арыі ў Індыю? У чым заключалася адрозненне паміж арыямі («сваімі») і дасамі («чужымі»)? Што такое варны? Назавіце варны. Хто да якой варны адносіўся? Хто займаў самае нізкае становішча? Калі ў Індыі ўтварылася магутная дзяржава? Хто быў яе заснавальнікам? Пры кім дзяржава дасягнула магутнасці?

**Настаўнік.** Слова «арыі» азначае «верныя», або «родныя». Да цяперашняга часу вучоныя спрачаюцца, адкуль яны прыйшлі. Адны лічаць, што з Цэнтральнай Еўропы, другія — з паўночнага ўзбярэжжа Чорнага і Каспійскага мораў. Спачатку арыі засялілі Іран і Сярэднюю Азію, а прыкладна каля 1500 г. да н. э. арыйскія плямёны захапілі Паўночна-Заходнюю Індыю. Паступова арыйцы змяшаліся з нашчадкамі індцаў і ўтварылі індыйскі народ. Асновай грамадскай арганізацыі стаў падзел на арыяў і дасаў. Сярод арыяў існаваў падзел на варны: брахманы, кшатрыі, вайш'і, шудры. *(Вучні запісваюць варны ў сшытак.)* Самае нізкае становішча займалі «недакранальныя». К I тыс. да н. э. у Індыі ўтвараюцца царствы на чале з раджамі (царамі). Стваральнікам першай індыйскай дзяржавы лічыцца правіцель Магадха, які праславіўся тым, што знішчаў прадстаўнікоў варны кшатрыяў, негатыўна ставіўся да рэлігіі, прымушаў насельніцтва плаціць вялікія падаткі. Індыец з варны кшатрыяў Чандрагупта з дзяцінства марыў аб пагібелі раджаў Магадха. Ён нават шукаў падтрымку ў вялікага палкаводца Аляксандра Македонскага, але той прагнаў яго. Дапамога прыйшла нечакана. Чандрагупта пазнаёміўся з брахманам, якога абразіў Магадха. Брахман расказаў Чандрагупце пра клад, схаваны ў гарах. Дзякуючы знойдзенаму кладу Чандрагупта сабраў вялікае войска, разбіў войска Магадхі і сам стаў раджам. Пры ім і яго сыне працягвалася заваяванне іншых зямель. Чандрагупта ўвёў новыя законы, стварыў магутную армію. Унук Чандрагупты Ашока працягваў ваяваць. Але карціны гібелі людзей настолькі ўразілі яго, што ён прыпыніў войны і ўстанавіў сяброўскія адносіны з суседнімі краінамі. Ён імкнуўся палепшыць жыццё людзей у сваёй краіне. *(Вучні запісваюць імёны гэтых правіцеляў.)*

**3. Гаспадарчае жыццё.**

Вучні разглядаюць наступны слайд і адказваюць на пытанні настаўніка: назавіце галоўныя заняткі індцаў. Якія металы былі вядомы індцам? На якім узроўні знаходзіўся гандаль?

**Настаўнік.** Галоўным заняткам было земляробства, вырошчвалі пшаніцу і ячмень, гэта было галоўным багаццем індцаў, для зерня будаваліся велізарныя сховішчы. Яшчэ вырошчвалі, упершыню ў свеце, бавоўну, цукровы трыснёг. Жыхары Інда таксама займаліся жывёлагадоўляй, разводзілі кароў, свіней, аслоў, сланоў. Асноўныя прылады працы — нажы, матыкі, наканечнікі коп'яў і стрэл — рабілі з медзі. Былі вядомы свінец, золата і бронза. Займаліся індцы прадзеннем, ткацтвам, ювелірнай справай. Пасля заняпаду Індскай дзяржавы развіццё амаль спынілася і аднавілася на мяжы II–I тысячагоддзяў да н. э. *(Выкарыстоўваецца матэрыял падручніка на с. 76–77.)*

***III. Замацаванне новага матэрыялу. Выкананне задання.*** *(Вучням раздаюцца карткі з тэставымі заданнямі.)*

***IV. Дамашняе заданне.*** § 24, пытанне на с. 88, № 1–5.

***V. Рэфлексія.*** Вучням раздаюцца карткі з намаляванымі на іх тварыкамі, якія паказваюць настрой: добры, задаволены, не вельмі задаволены, зусім незадаволены — і прымацоўваюцца да дошкі.

**Тэставыя заданні**

**1. Якія рэкі цякуць у Індыі:**

а) Тыгр і Еўфрат;
б) Ніл;
в) Інд і Ганг.
*Адказ:* в.

**2. Як называліся старажытныя сталіцы Індскай дзяржавы:**

а) Мемфіс і Фівы;
б) Вавілон і Ніневія;
в) Махенджа-Дара і Харапа;
г) Тыр і Бібл.
*Адказ:* в.

**3. Суаднясіце варны ў Індыі з іх абавязкамі:**

1. Выкананне самых брудных і цяжкіх работ.
2. Выкананне рэлігійных абрадаў.
3. Праца ў якасці слуг.
4. Праца ў сельскай гаспадарцы, рамяство, гандаль.
5. Удзел у ваенных паходах, кіраванне краінай.

а) брахманы;
б) кшатрыі;
в) вайш'і;
г) недакранальныя;
д) шудры.

**4. Калі ў Індыі ўтварылася магутная дзяржава, якую заснаваў Чандрагупта:**

а) у IV ст. да н. э.;
б) у II ст. да н. э.;
в) у I ст. да н. э.?

**5. Устаўце прапушчаныя словы.**

Найвышэйшай магутнасці гэта дзяржава дасягнула пры ўнуку Чандрагупты ____________, які правіў у сярэдзіне III ст. да н. э.

# Древний Восток и Америка

## Урок всемирной истории в V классе

**Т. Г. Наркевич**, учитель истории и немецкого языка Лудчицкого УПК «детский сад — средняя школа» Быховского района

**Цель:** определить основные достижения цивилизаций Древнего Востока.

**Задачи:** в игровой форме пополнить, закрепить и обобщить знания по теме «Древний Восток и Америка»; контролировать усвоение учащимися учебного материала по теме; повышать познавательный интерес к изучению истории Древнего мира; продолжить развивать логическое мышление, учить сопоставлять и систематизировать знания по теме; воспитывать ответственное отношение к коллективному делу.

**Тип урока:** урок-обобщение.

**Форма урока:** урок-игра.

**Оборудование:** презентация к уроку, чёрный ящик, сахар, «дарики», карточки с названием команд и рисунками (логотипами), конверты с вопросами, кроссворды, красные ручки, бейджики.

### Ход урока

***I. Организационный момент.***

***II. Актуализация темы. Постановка учебной задачи. План работы.***

**Учитель.** Тема сегодняшнего урока — «Повторение-обобщение “Древний Восток и Америка”». Вы уже изучили второй раздел книги «Древний Восток и Америка», познакомились с многими древними государствами Древнего Востока.

*(Учитель обращает внимание учащихся на экран мультимедийного проектора и предлагает внимательно ознакомиться с целью и задачами урока.)*

Реализовывать цель мы будем в виде игры «Путешествие по станциям Древнего Востока и Америки». На станциях вы будете зарабатывать «дарики» (монеты, которые появились в VII в до н. э. и были названы в честь Дария I).

***III. Организация обобщения-повторения. Проведение игры.***

— Но сначала давайте разделимся на 4 команды.



gisdapanoga.by